Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Хроніка пераследу 26-27 лістапада дапоўнена

27.11.2022 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, палітвязні, пераслед, ціск, рэпрэсіі, справа Вясны

**У Беларусі па-ранейшаму працягваюцца затрыманні, ператрусы, катаванні ў ізалятарах, аказваецца ціск на палітвязняў, незалежныя медыяпрадукты прызнаюць экстрэмісцкімі матэрыяламі. Адбываюцца рэпрэсіі ў дачыненні да грамадзян, якія актыўна выказваюць сваю пазіцыю ў адносінах да вайны, распачатай узброенымі сіламі Расіі. Праваабарончы цэнтр "Вясна" 26-27 лістапада збірае апошнія факты палітычнага пераследу беларусаў – інфармацыя ўвесь час дапаўняецца.**

***Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам:***

- ***праз тэлеграм-бот @viasna_bot;***
- ***на гарачую лінію ў тэлеграм @ViasnaSOS, @SOSViasna***

## Праваабаронца Наста Лойка не выйшла на волю пасля чарговых 15 сутак арышту — яна знаходзіцца на перазатрыманні ў Першамайскім РУУС

У РУУС атрымалася перадаць для яе рэчы, лекі і сродкі гігіены.

Нагадаем, Насту затрымалі 28 кастрычніка. Пазней праваабаронцы двойчы прысудзілі па 15 сутак арышту за «дробнае хуліганства» (арт. 19.1 КаАП).

На мінулым судзе Наста распавядала пра катаванні — **супрацоўнік ГУБАЗіК ударыў яе электрашокерам, а адзін з супрацоўнікаў ЦІП вывеў яе ва ўнутраны двор і пакінуў без вопраткі на 8 гадзін**.

# Верхнядзвінская актывістка Валянціна Болбат знаходзіцца пад арыштам




Праваабаронцам стала вядома, што Валянціну асудзілі да арышту на 10 сутак. Але няма звестак пра тое, у чым канкрэтна абвінавацілі актывістку, і не зразумела, калі над ёй адбыўся суд.

Паводле звестак, якімі падзяліліся сябры спадарыні Валянціны, 22 лістапада ў яе адбыўся ператрус, а потым некалькі гадзін актывістку апытвалі пра кіраўніцтва руху «За свабоду», у прыватнасці, пра Юрыя Губарэвіча.

У праваабаронцаў ёсць падставы меркаваць, што асудзіць актывістку маглі паводле арт. 19.11 КаАП. Але высветліць гэта дакладна можна будзе хіба толькі тады, калі Болбат выйдзе на волю.

---

# Пасля 88 сутак арышту на волю не выйшаў святар Уладзіслаў Багамольнікаў

Ён быў затрыманы 31 жніўня і з таго часу знаходзіцца на Акрэсціна, адбыўшы 6 адміністрацыйных тэрмінаў запар. Чакалася, што ён мусіць выйсці сёння, але гэтага не адбылося. Мяркуючы па ўсім, на яго быў складзены новы пратакол і ён зараз у статусе затрыманага чакае чарговы суд.

Святар за кратамі чытае лекцыі па філасофіі для сваіх сукамернікаў — менавіта гэты прадмет ён выкладае і ў Мінскай духоўнай акадэміі. Таксама ён духоўна падтрымлівае іншых зняволеных, сярод якіх карыстаецца вялікай павагай.

Багамольнікаў — выкладнік Мінскай духоўнай акадэміі, абвяшчаў галадоўку ў падтрымку палітвязня **Ігара Лосіка**, а таксама служыў літыю па забітым сілавікамі **Раману Бандарэнку.**

---

# Міліцыя апытала бацьку ксяндза Вячаслава Барка

**Бацька каталіцкага святара Вячаслава Барка жыве ў Міёрах Віцебскай вобласці. Яго апыталі ў сувязі з удзелам ксяндза ў відэа для канала "Хартыя-97", апублікаваным два месяцы таму.**

Пытанні датычыліся таго, ці ўжывае ксёндз Вячаслаў алкаголь і наркотыкі, ці мае маёмасць і калі вернецца ў Беларусь.

Ксёндз Вячаслаў Барок — вядомы каталіцкі святар, аўтар ютуб-канала. У 2021 годзе быў змушаны выехаць у Польшчу ў сувязі з палітычным пераследам. Цяпер кіраўнік беларускай каталіцкай супольнасці ў Варшаве.

---

# Удзельнікі гурта Litesound знаходзяцца на «Валадарцы»

**Праваабаронцам стала вядома, што браты-музыкі Дзмітрый і Уладзімір Каракіны знаходзяцца ў СІЗА-1 на Валадарскага.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, ім інкрымінаваны арт. 342 КК (актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак).

Нагадаем, пра іх затрыманне праўладныя тэлеграм-каналы напісалі 13 кастрычніка — паводле іх, браты *«ўдзельнічалі ў незаконных маршах з перакрыццем дарог, заклікалі і агітавалі ў сацыяльных сетках, супрацоўнічалі з экстрэмісцкімі арганізацыямі».*

---

# Справу «Вясны» перадалі ў пракуратуру

**Дзяржаўная газета «СБ» са спасылкай на СК паведамляе пра тое, што крымінальная справа ў дачыненні да Алеся Бяляцкага, Валянціна Стэфановіча і Уладзіміра Лабковічаперададзена ў пракуратуру для накіравання ў суд.**

Паводле ведамства, праваабаронцы нібыта датычныя да кантрабанды 290.000$ праз мяжу Беларусі, а таксама да «аплаты штрафаў тых асоб, якія здзейснілі правапарушэнні». Алесю, Валянціну і Уладзю пагражае да 12 гадоў калоніі.

**Падтрымаць палітвязняў**: *СІЗА-1, 220030, Мінск, Валадарскага, 2, Аляксандру Віктаравічу Бяляцкаму, Валянціну Канстанцінавічу Стэфановічу, Уладзіміру Мікалаевічу Лабковічу*

# Супраць удзельнікаў Аб'яднанага Пераходнага Кабінета распачата «спецвытворчасць» — іх можа чакаць завочны суд

*«Мы працягваем фіксаваць супрацьпраўную дзейнасць усіх удзельнікаў [АПК]. Якія б яны новыя назвы не прыдумлялі — сутнасць застаецца такой жа. Яны як былі людзьмі без радзімы і сцяга, такімі і засталіся. Бо ўсё тое, чым займаецца кожны ўдзельнік пераходнага кабінета — гэта экстрэмісцкая дзейнасць, а кожны іх намер — гэта шкода нацыянальнай бяспецы»*, — распавёў намеснік старшыні Следчага камітэта **Анатоль Васільеў**.

Твитнуть






Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях









## АПОШНІЯ НАВІНЫ

У калоніі памёр палітвязень Мікалай Клімовіч. Яго асудзілі да зняволення, негледзячы на захворванне сэрца

Мастака Генадзя Драздова асудзілі да трох гадоў калоніі

Падазраюць у здрадзе дзяржаве і здзяйсненні акту тэрарызму: хроніка пераследу 10-11 траўня

Адвакатку Анастасію Лазарэнку асудзілі да 6 гадоў калоніі

Гімн Украіны ў караоке, БЧБ-чахол, пікетаванне ў тралейбусе: за што беларусаў судзілі ў красавіку

Затрыманні настаўнікаў, супрацоўнікаў радыё, фатографа: хроніка пераследу 4-9 траўня

У Гомелі пачнуць судзіць журналіста-фрылансера і краязнаўцу Яўгена Меркіса

У Брэсце асудзілі айцішніка за абразу Аляксандра Лукашэнкі

21 траўня — Дзень палітвязняў у Беларусі. Далучайся да акцый салідарнасці!

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023



# Рэферэндум 2022







## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh



















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

